самому сабе: “Я – паэт…”; Што?! Лондан – радасць? Лондан – гора: / ў Paris-Soir чытаў я ўчора….; Il pleut doucement sur la ville*. Арцюр Рэмбо – эпіграф да верша “Слёзы ў сэрцы маім..” , зноска-пераклад * Над местам далікатны дождж (франц.). Ілюстрацыйны матэрыял дэманструе спалучэнне разнастайных сродкаў выразнасці графічнага ўзроўню: петыт, варварызмы, а таксама вялікая літара ў займенніку Ты, дзе яна выконвае стылістычную функцыю і дае магчымасць падкрэсліць значнасць асобы.

Відавочна, што графіка (сістэма графічных сродкаў) стала крыніцай выразнасці мовы аналізуемай кнігі Л. Дранько-Майсюка.


1. *Москвин, В.П.* Стилистика русского языка. Теоретический курс / В.П. Москвин. – Ростов н / Д : Феникс, 2006. – С. 62.

2. *Винокур, Г.О.* Культура языка: Очерк лингвистической технологии / Г.О. Винокур. – М., 1925. – С. 132, 135.


# ПАНЯЦЦЕ І ЗМЕСТ МУЗЫЧНАЙ ПАСХАЛЬНАЙ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ТРАДЫЦЫІ


**Раманенкава В. І.**

*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры,*
*выкладчык кафедры беларускай народнапесеннай творчасці*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*


Рымска-каталіцкая музычная культура грунтуецца на глыбокіх традыцыях, якія адлюстроўваюць асаблівасці вытворчай дзейнасці, духоўны патэнцыял народа. Традыцыі – гэта феномен культуры; яны адыгрываюць выключную ролю ў міжпакаленных сувязях, у захаванні і развіцці духоўнай спадчыны, у забеспячэнні жыццядзейнасці народа. Асабліва моцнымі ў любым грамадстве з’яўляюцца рэлігійныя традыцыі. У Беларусі найбольш устойлівымі рэлігійнымі традыцыямі, якія аказалі вырашальны ўплыў на станаўленне культуры грамадства, з’яўляюцца каталіцкая і праваслаўная традыцыі. Вядучае і галоўнае месца сярод традыцый беларускіх католікаў займаюць хрысціянскія святы (Вялікдзень, Божае Нараджэнне і інш.), хрысціянскія абрады (Хрышчэнне, Пахаванне і інш.).

Рымска-каталіцкія традыцыі непарыўна звязаны з царкоўным годам, які называецца літургічным годам і з’ўляецца цыклічным успамінам, перажываннем і святкаваннем нараджэння і ўваскрасення Езуса Хрыста, як у царкоўным так і ў бытавым асяроддзі. Рымска-каталіцкія традыцыі праяўляюцца праз музычнае мастацтва, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, тэатральнае мастацтва, архітэктуру, скульптуру, жывапіс, дызайн і іншыя віды мастацтваў. Музыка, у сваю чаргу, як від мастацтва ўздзейнічае на ўспрыманне чалавекам эстэтычных уяўленняў, валодае моцным каардынацыйным імпульсам, на падсьвядомым узроўні, у галіне пачуццяў і, у некаторай ступені,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

розуму чалавека. “Музыка – від мастацтва, разлічаны на слыхавае ўспрыманне і, які адрозніваецца прамым і асабліва актыўным дзеяннем на пачуцці людзей” – так гучыць адно з азначэнняў [3, с. 210-216]. Галоўным выразным сродкам музычнага мастацтва з’яўляецца гук і кампаненты музычнай формы: мелодыя, паліфонія, гармонія, рытм, кампазіцыя і інш.

Пасхальная традыцыя бярэ свой пачатак у набажэнстве і з’яўляецца арганічнай часткай славянскай народнай традыцыі, якая па-свойму пераасэнсавала хрысціянскую сімволіку гэтага свята, а таксама ўвабрала значную колькасць дахрысціянскіх славянскіх звычаяў і абрадаў.

У кнізе “Гістарычная этналогія” вядомага расійскага культуролага С. Лурье пададзены вельмі шырокі аналіз тэрміна “традыцыя”. Яна заяўляе пра тое, што “традыцыя” гэта штосці, што знаходзіцца ў пастаянным працэсе змены. Змены – як малай, так і глабальнай, – звязанай са зменамі ўсяго каркаса грамадства [2, с. 223-227]. Такі погляд на традыцыю пачаў развівацца ў даследаваннях расійскіх вучоных з 60-70-х гадоў ХХ стагоддзя (Э.С. Маркаран, К.В. Чыстоў і інш.).

Мы ў сваім даследаванні будзем арыентавацца на тое, што рымска-каталіцкая царкоўная і бытавая музычныя пасхальныя традыцыі – гэта трывалая мастацка-культурная з’ява, якая фарміравалася і развівалася некалькі стагоддзяў і цяпер паўстае як пастаянна змяняючаяся адзінка, якая ўбірае ў сябе культурныя здабыткі мінулых пакаленняў і выпрацоўвае ўласна свае – сучасныя традыцыі.

Музычная традыцыя рымска-каталіцкай царквы мае дзве галіны існавання: царкоўную (літургічную) і бытавую (народную, нелітургічную).

Да літургічнай рымска-каталіцкай традыцыі адносяцца ўсе віды мастацтва, якія фарміруюць храмавую богаслужбовую прастору, богаслужбовыя дзеянні, а таксама багаслоўскае напаўненне літургіі згодна з сфармуляванымі кананічнымі патрабаваннямі.

Бытавое музычна-рэлігійнае мастацтва не абмежавана царкоўнымі канонамі і таму мае свабодную форму панавання і рэпрэзентацыі. Некаторыя даследчыкі рэлігійнай музыкі бытавыя рэлігійныя спевы называюць паралітургічнымі або нелітургічнымі, ці пазалітургічнымі. В. Зосім прапаноўвае бытавую рэлігійную спеўную творчасць падзяляць на дзве галіны – нелітургічную і паралітургічную (вылучае гэтыя тэрміны як самастойныя спеўныя жанры) [1, с. 424-432]. Яна абазначае галоўную характэрную асаблівасць нелітургічных песен – небогаслужбовае выкананне рэлігійных твораў. Паралітургічная музыка, па меркаванні В. Зосім, мае больш цеснае дачыненне да літургіі – гэта творы, якія выконваюцца ў храме, але не выкарыстоўваюцца, як складнік набажэнства. Непераадольнай мяжы паміж гэтымі дзвюма веткамі спеўнага мастацтва не існуе, яны могуць узаемаперамяшчацца з адной сваёй уласцівасці ў другую, але пастаянна застаюцца неаддзельнай часткай бытавой рэлігійнай музыкі. Мы у сваім даследаванні будзем прытрымлівацца тэрмінаў “бытавая рэлігійная музыка”, “нелітургічная музыка”, “паралітургічная музыка”, як падобныя складаючыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аднаго сінанімічнага рада.

Безумоўна, літургічная і бытавая музычныя практыкі маюць глыбокія карані ўзаемасувязі. З часоў сярэднявечча аб канонах літургічнай музыкі пісалі і гаварылі вельмі шмат, як даследчыкі музыкі, так і кіраўніцва царквы. Зафіксавана гэта ў сярэднявечных трактатах, царкоўна-прававых і заканадаўчых дакументах.

Пачынаючы з першага, яшчэ не сусветнага, Іерусалімскага сабора (прыкладна 49 г.) да Трэцяга Таледскага сабора[1] (589 г.) аб нелітургічнай (народнай) музыцы на сходах увогуле не ўзгадвалі. Канстанцінопальскім Саборам[2] 692 года было вырашана канчаткова знішчыць тое, што называюць “Calendes”, “Voeux”, “Brumaires” (Калядкі, песні-пажаданні) [5, с. 86].

Актыўныя крокі наперад (па ўкараненні ў літургічны абіход) традыцыйная рэлігійная музыка пачала рабіць прыкладна ў XVI–XVIII стст., калі некаторыя набажэнствы спяваліся на родных мовах, а не на лацінскай мове, як было раней (напрыклад, “Песні жальбы”[3], Маёвае набажэнства[4], пачатак XIX ст.). Такога кшталту песні хутка распаўсюджваліся сярод вернікаў, дзякуючы народнай мове, іх хутка запаміналі і спявалі ў дамах. Але афіцыйна царквой такія песні не прызнаваліся літургічнымі.

Пасля першага Ватыканскага сабора (1869–1870) адбылося пераасэнсаванне духавенствам традыцыйнай рэлігійнай музыкі. Яе паўнаўласна дазволена выкарыстоўваць падчас набажэнстваў у вызначаны момант.

Папа Пій XII[5] у энцыкліцы аб сакральнай музыцы “Encyklika musicae sacrae disciplina” (1955) звяртае ўвагу на тое, што трэба цаніць таксама і тую музыку (маецца на ўвазе традыцыйную (народную) рэлігійную музыку), якая не належыць непасрэдна да Святой Літургіі, але прыносіць значную карысць для рэлігійнага жыцця вернікаў, дзякуючы чаму можа называцца “рэлігійнай музыкай” [4, с. 72]. Аб прысутнасці ў хрысціянскім жыцці католікаў на Беларусі традыцыйных рэлігійных песень сведчацць музычныя зборнікі, якія выкарыстоўваліся вернікамі на літургіі, напрыклад: “Kantyczka czyli Pieśni nabożne” (1885) [6], “Cantus ecclesiastici” (1911) [7], “Cantionale ecclesiasticum Romano-catholicicum” (1862)[6] [8]. Гэтыя зборнікі змяшчаюць ноты, тэксты літургічных і рэлігійных песень, дзе асобнае месца займаюць песні на Вялікі

---

[1] Таледскі сабор 589 г. Вядомы таксама як Трэці Таледскі сабор, скліканы вестгоцкім каралём Рэккарэда I пасля яго пераходу з арыянства ў каталіцтва, завяршыў арыянскі перыяд у гісторыі вестготаў. Сабор палажыў пачатак новага этапу ўзаемадзеяння царквы і дзяржавы ў Іспаніі.

[2] Трульскі сабор, таксама Пято-шосты сабор (грэч. Πενθέκτη Σύνοδος) – сабор Царквы ў Канстанцінопалі ў 691 – 692 гг., скліканы імператарам Юстыніянам II у 691 г.. Яго дакументы маюць выключна важнае значэнне як крыніца ўнутранага царкоўнага права для праваслаўных Цэркваў, якія разглядаюць іх як дакументы Шостага Сусьветнага сабору.

[3] Песні жальбы – набажэнства эўхарыстычнага характару, у тэкстах якіх закладзена гісторыя пакут і смерці Ісуса Хрыста.

[4] Маёвае набажэнства – набажэнства, якое адзначаецца ў маі каталіцкай царквой у гонар Маці Божай, на працягу якога адмаўляецца ці спяваецца Лёрэтанская Літанія і малітва “Тваёй абароне”.

[5] Пій XII (лац. Pius XII, да інтранізацыі – Эудженіо Марыя Джузэпэ Джавані Пачэлі, італ. Eugenio Maria Giuseppe Giovanni Pacelli; 1876-1958 гг., – Папа рымскі з 2 сакавіка 1939 г., абвясціў дагмат аб Унебаўшэсці Дзевы Марыі і сімвалічна прысвяціў Свет Беззаганнаму сэрцу Марыі ў 1942 г.

[6] Пералічаныя зборнікі песень зафіксаваны намі ў 2012-2013 гг. падчас навуковых экспедыцый па Гродненскай і Віцебскай абласцях.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пост і Пасху, а таксама даюцца невялікія каментарыі да святаў.

Элементы пасхальнай музычнай спадчыны і, у прыватнасці, віды і жанры рэлігійна-бытавога мастацтва, могуць выступаць у якасці актыўнага ці пасіўнага пласта культуры. У першым выпадку гаворка ідзе аб элементах культуры, якія існуюць у сацыяльна-бытавым асяроддзі супольнасці, у другім, – аб тых, што адклаліся ў гістарычнай памяці грамадства. Для таго, каб іх вызваць да жыцця, патрэбныя спецыяльныя намаганні, сітуацыі, якія правакуюць асаблівую цікавасць да гэтага культурнага матэрыяла; і ў выніку можам назіраць пераход ад пасіўных да актыўных элементаў рэлігійна-бытавой традыцыі, якая, такім чынам, атрымлівае новае жыццё ў грамадстве у новых культурных умовах.

Падводзячы выснову, можам сказаць, што пасхальная традыцыя ў кантэксце царкоўнай і бытавой рэлігійнай музыкі – гэта развітая мастацкая сістэма, якая заснавана на глыбокіх традыцыях мінулых часоў і на распрацоўцы біблейскіх, хрысціянскіх і дахрысціянскіх архетыпаў у кантэксце актуальных жыццёвых праблем, народных ідэалаў. Бытавая традыцыя – гэта шырокае кола вытокаў разнастайных па свайму характару і спосабу бытавання – абрады, вераванні, фальклор, якія ўключаюць у сябе ўсе віды мастацкай творчасці (спевы, дэкаратыўна прыкладное мастацтва, тэатралізаваныя дзействы і інш.). Закладзеныя ў бытавой традыцыйнасці высокая духоўнасць і маральнасць выступаюць гарантамі гарманізаванай арганізацыі духоўнага ўкладу грамадства.

1. *Зосим, О.* Восточнославянская духовная песенность: литургический аспект / О. Зосим // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. – Вып. 5. – Минск : БГАМ, 2011. – С. 424–432.

2. *Лурье, С. В.* Историческая этнология : учеб. пособ. для вузов. – М. : Аспект Пресс, 1997. – 448 с.

3. *Мамонтов, С. П.* Основы культурологии : учеб. пособ. для вузов / С.П. Мамонтов. – М. : Изд-во РОУ, 1996. – 271 с.

4. *Encyklika* Musicae sacrae disciplina 1955 r. / Wiadomości Diecezjalne. – Katowice : Organ Urzędowy Archidiecezji Katowickiej, 1957 – S. 61–83.

5. *Concilium* Constantinopolitanum a. 691/2 in Trullo habitum. H. Ohme (ed.) Acta conciliorum oecumenicorum, Series Secunda II: Concilium Universale Constantinopolitanum Tertium. – Berlin ; Boston : De Gruyter, 2013. – Pars 4. – 131 p.

6. *Johner, D.* Cantus ecclesiastici juxta editionem vaticanam / D. Johner. – Ratisonae Romae: F. Pustet ; Neo Eboraci Cincinnati, 1911. – 150 p.

7. *Kantyczki* czyli Pieśni nabożne domowe. – Poznań: Księgarnia Katolicka, 1885. – 320 s.

8. *Rzymski, P.* Cantionale Ecclesiasticum / P. Rzymski. – Vilnae: J. Zawadzki, 1862. – 301 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ